# Кропка прафесійнага росту

**У адпаведнасці з Рэспубліканскім каардынацыйным планам мерапрыемстваў дадатковай адукацыі педагогаў на 2021 год працуе рэспубліканская сеткавая кансультацыйна-метадычная лабараторыя па каардынацыі работы з намеснікамі дырэктараў па выхаваўчай рабоце "Кропка росту", у якой ужо зарэгістравана больш за сто ўдзельнікаў, што сведчыць аб зацікаўленасці педагогаў у атрыманні актуальнай інфармацыі па пытаннях выхавання.**

Сеткавая метадычная лабараторыя як форма метадычнай работы мае шэраг пераваг: аптымальны доступ да атрымання інфармацыі ў любы час і ў любым зручным месцы; матэрыялы даступны ў анлайн-рэжыме і імі могуць свабодна карыстацца ўсе педагогі краіны; маецца магчымасць неаднаразовага звароту да размешчаных матэрыялаў, а таксама ўнікальны шанс прадстаўлення ўласнага вопыту работы.

На цяперашні час працуюць і папаўняюцца раздзелы "Арганізацыя самакантролю ва ўстанове адукацыі", "Планаванне", "Матэрыялы ў дапамогу класнаму кіраўніку для падрыхтоўкі першага ўрока, прысвечанага Году народнага адзінства". У раздзеле сеткавай метадычнай лабараторыі "Арганізацыя самакантролю ва ўстанове адукацыі" размешчаны вытрымкі з нарматыўных дакументаў, зборнік матэрыялаў e-mail-канферэнцыі "Самакантроль намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце як інструмент кіравання якасцю выхавання вучняў", публікацыі з часопісаў. У раздзеле "Планаванне" ўдзельнікі сеткавай метадычнай лабараторыі з розных куткоў краіны падзяліліся ўласным вопытам. Таксама раздзел змяшчае нарматыўныя дакументы, метадычныя рэкамендацыі, артыкулы па гэтай тэматыцы з навукова-метадычных часопісаў.

У раздзеле "Матэрыялы ў дапамогу класнаму кіраўніку для падрыхтоўкі першага ўрока, прысвечанага Году народнага адзінства" размешчаны распрацаваныя планы-канспекты класнай гадзіны, квест-круізу, гульні-падарожжа, калектыўнай творчай справы для вучняў розных узростаў. Акрамя гэтага, прапануюцца метадычныя распрацоўкі першых урокаў мінулых навучальных гадоў з вопыту педагогаў устаноў агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай адукацыі, публікацыі з навукова-метадычных і навукова-практычных часопісаў. Рэспубліканская сеткавая кансультацыйна-метадычная лабараторыя па каардынацыі работы з намеснікамі дырэктараў па выхаваўчай рабоце "Кропка росту" (знайсці адпаведны раздзел метадычнай лабараторыі можна па спасылцы *https://do.academy.edu.by/course/index.php?categoryid=4*) развіваецца: у хуткім часе адкрыюцца раздзелы з матэрыяламі ў дапамогу класным кіраўнікам, педагогам-арганізатарам, дзе можна будзе азнаёміцца з вопытам работы педагогаў з розных устаноў адукацыі, каб выкарыстаць у сваёй рабоце. Найбольш актыўныя ўдзельнікі сеткавай метадычнай лабараторыі па выніках работы ў снежні 2021 года будуць адзначаны сертыфікатамі.

Рэспубліканская сеткавая кансультацыйна-метадычная лабараторыя па каардынацыі работы з намеснікамі дырэктараў па выхаваўчай рабоце "Кропка росту" дазваляе педагогам краіны бесперапынна павышаць свой прафесіяналізм і ўдасканальваць прафесійныя кампетэнцыі.

**Аляксандра ЧАРВІНСКАЯ,
метадыст упраўлення
сацыяльнай і выхаваўчай работы
Акадэміі паслядыпломнай
адукацыі.**